

## Кастусь ЦЫБУЛЬСКІ

## У сэрцы народа жывуць песняры

*Ліпеньскі вечар. Ласкавае сонца.
Пахам жытнёвым напоены дзень.
Пыльнай дарогай са станцыі
Стоўбцы
Янка Купала ў Смольню ідзе.*

*Колас не ведае, што без дамовы
Сёння ён ноч правядзе давідна
З тым, хто спяшае
ў касцюмчыку новым,
Нагаварыцца і выпіць віна.*

*Лес векавы. У разбежку дарогі.
Выбраць якую? Спытаць у каго?
Ноч ужо хутка, навокал нікога,
А шыбаваць яшчэ шмат, ого-го!*

*Толькі вадой пацягнула рачною,
Справа прагаліны, Нёман відаць.
І каля рэчкі вячэрняй парою
Змог-такі Смольню паэт адшукаць.*

*...Думаць не думаў узрушаны Колас,
Што ў яго доме сядзіць за сталом
Той, хто «Жалейцы» даў сілы і голас,
Хто «Гусляром» разануў, як мячом!*

*Ды і ў самога багаж адмысловы:
Ужо «Песні жальбы» пабачылі свет,
З «Новай зямлі» цытаваліся словы,
Што у паэме рассыпаў паэт.*

*...Там у абдымках сышліся паэты
Шчырай размовай душу наталіць.
Два аднагодкі, два рыцары свету,
Гонар святой беларускай зямлі!*

*Янка забыў і пра сцёртыя ногі,
Цесны касцюм, што Якуба смяшыў.
Іх, такіх розных ды родных, дарогі
К славе сусветнай вялі да вяршынь!..*

*...Сотня гадоў пралящела у вырай,
Ім не вярнуцца назад на зары.
Грае ж Купалы і Коласа ліра,
У сэрцы народа жывуць Песняры!*

## Бацькава доля

*Стаў бацька ў полі зямельку араці,
А маці ля печы бліны выпякаці.
Стаў бацька да плуга сыночкаў гукаці,
А дзеткі ў застоллі —
частуе іх маці.*

*Знямогся араты, прысеў пад альхою,
А побач гусляр, ды з сівой барадою.
Зайграў ён на гуслях, і песня над полем
Панеслася ў неба пра бацькаву долю.*

*Гусляр:
Добра полю ды за борам,
У мароз са сцюжаю.
Добра плугу ды ў разоры,
Калі рукі дужыя.
Добра хлебу за блінамі,
Калі бульба спраўная,
Добра бацьку за сынамі,
Калі дзеці слаўныя!*

*Музыку сівенькага ў вёсцы пачулі,
І сорамна стала сынам і матулі.
Сабрала сняданак, гукнула сыночкаў,
І сталі араці яны аж да ночкі...*

*Шчэ доўга гучалі чароўныя гуслі,
Каб мір і спагада жылі ў Беларусі!*

## Яркай зорцы Беларусі

Марыне Васілеўскай

*Ёсць таленты — самоту гнаць з душы,
Як весні вецер праганяе хмары.
Так лашчыць сонца долы і абшары,
І хочацца кахаць, тварыць і жыць!*

*Так на зямлі прызванне Мастака,
Што Усявышнім звыш наканавана,
Лячыць людскія боль, спакусы, раны
І зоркаю свяціць нам у вяках!*

*Такая зорка сёння грэе нас,
Прыгожая і талентам, і тварам.
Няхай з дажджамі лістапада хмары,
Ды песнямі сагрэла нас яна!*

*Дай Бог узяць ёй рубяжы вышэй!
У Ніцы, у Сан-Рэма, у Ла-Скала.
Каб зорка Беларусі ярка ззяла
І з кожным днём гарэла ўсё ярчэй!*